PolotskSU




21. Kąkolewski, I. Melancholia władzy. Problem tyranii w europejskiej kulturze politycznej XVI stulecia / I. Kąkolewski. – Warszawa : Neriton, 2007. – 481 s.
22. Kriegseisen, W. Stosunki wyznaniowe w relacjach państwo-kościół między reformacją a oświeceniem: (Rzesza Niemiecka, Niderlandy Północne, Rzeczpospolita polsko-litewska) / W. Kriegseisen. – Warszawa : Semper, 2010. – 710 s.
23. Волян, А. Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе / А. Волян ; пер. з лац. У. Шатона. – Мінск : Зміцер Колас, 2009. – 142 с.
24. Śmiglecki, M. Nauka krótka o lichwie, y o wyderkach, czynszach, spolnych zarobkach, naymach, arendach, y samokuprstwie / M. Śmiglecki. – Wilno : Druk. Akademiey Societatis Iesu, 1753. – 166 s., [32] k.
25. Śmiglecki, M. O lichwie y trzech przednieyszych kontraktach: wyderkowym, czynszowym y towarzystwa kupieckiego nauka krótka / M. Śmiglecki. – Kraków : Wyd. Lazarzowe, 1596. – 71 s.


**SOCIO-POLITICAL IDEAS IN THE DISCOURSE OF VINIUS NEOSCHOLASTICS IN THE LATE 16th – EARLY 17th CENTURIES**

I. BORTNIK

*This article is devoted to the explication and comprehensive analysis of socio-political ideas in the discourse of Vilnius neo-scholasticism in the 16th – early 17th centuries. The works of Jesuit intellectuals who worked at the Jesuit Academy of Vilnius during the period under review were used as primary sources: Jakub Wujek, Stanisław Grodzicki, Marcin Śmigliecki and Marcin Łaszcz. The article examines the views of Jesuit authors on the problems of society and the state, various forms of law. It is noted that the discourse of Vilnius neo-scholasticism affirms the priority of ecclesiastical power over the state, the need for the domination of a single Catholic denomination in the state and repressive actions against «heresy». The views of the Vilnius Jesuits on the forms of state and political system are highlighted. It is noted that when considering the social structure of society, Jesuit authors adhere to the traditional estate concept.*

***Key words:*** *Warsaw Confederation, Jesuit Academy of Vilnius, society, state, discourse, Jesuit, heresy, neo-scholasticism, law, estate, church.*

УДК 726.03:271.5(476)«15/17»

# ІДЭАЛАГІЧНАЯ ПРАГРАМА ХРАМАБУДАЎНІЦТВА ОРДЭНА ЕЗУІТАЎ У КАНТЭКСЦЕ ГІСТОРЫІ АРХІТЭКТУРЫ БЕЛАРУСІ

**Габрусь Т.В.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*Артыкул прысвечаны асвятленню ролі ордэна езуітаў у фарміраванні эстэтычнй канцэпцыі сусветнага архітэктурна-мастацкага стылю барока і ў манументальным храмабудаўніцтве Беларусі ў прыватнасці*

***Ключавыя словы:*** *храмабудаўніцтва, езуіты, стыль барока, архітэктурная адукацыя, узаемаўплыў буудаўнічых традыцый*

Генетычная повязь узнікнення і пашырэння стылю барока з ідэалогіяй контррэфармацыі і дзейнасцю ордэна езуітаў у сусветным мастацтвазнаўстве з’яўляецца ўстойлівым пастулатам. з гэтай прычыны ў былым савецкім мастацтвазнаўстве, дзе негатыўнае стаўленне да каталіцкай царквы і Ватыкана доўгі час экстрапаліравалася на ўсё мастацтва барока, яго вывучэнне моцна пацярпела ад вульгарнай сацыялагізацыі. Паўстагоддзя таму нават дастаткова аб’ектыўная маскоўская даследчыца А. Квітніцкая пры вывучэнні архітэктуры барока ў Беларусі канцэнтравала ўвагу толькі на будаўніцтве езуітаў [1]. Аднак, на нашу думку, такі падыход з’яўляецца абмежаваным, таму што аднабакова адлюстроўвае ўплыў ідэалагічнай праграмы езуітаў на архітэктуру Беларусі, не зважаючы адваротнага ўздзеяння мясцовых будаўнічых традыцый на фарміраванне нацыянальнага варыянта стылю барока.

Сфера місіянерска-асветніцкай дзейнасці ордэна езуітаў, у тым ліку ў Рэчы Паспалітай і на Беларусі ў прыватнасці, надзвычай абшырная і ёй прысвечаны шматлікія даследаванні. За прайшоўшыя гады беларускія і польскія даследчыкі значна ўзбагацілі гістарычную факталогію, удакладнілі даты будаўніцтва шэрагу езуіцкіх касцёлаў і калегіумаў на Беларусі [2]. На гэтай падставе неабходна вызначыць сапраўднае месца "езуіцкага" барока ў кантэксце мураванага сакральнага дойлідства Беларусі перыяду Рэчы Паспалітай, пазбавіўшыся сацыялагічнай перадузятасці. Мы засяроджваем увагу на тых з’явах і фактах, якія дапамогуць раскрыць пэўную эстэтычную праграму храмабудаўніцтва гэтага ордэна і іманентную трансфармацыю яго мастацкіх сродкаў. з гэтай мэтай намі прааналізавана гісторыя будаўніцтва і стылявыя характарыстыкі 20 мураваных езуіцкіх комплексаў, узведзеных у розных рэгіёнах Беларусі, пачынаючы з 2-й паловы XVI і па канец XVIII ст., і вызначаны пэўныя рэгіянальныя адметнасці [3].

Каталіцкая царква надавала вялікую ўвагу семантыка-ідэалагічнай праграмнасці культавай архітэктуры. Пры будаўніцтве галоўнага храма каталіцкага свету – сабора св. Пятра ў Рыме, якое цягнулася больш за паўтара стагоддзя, некалькі разоў папераменна мянялася форма крыжа, закладзенага ў аснову яго архітэктурнай кампазіцыі ад грэчаскага да лацінскага і наадварот у залежнасці ад патрабаванняў заказчыкаў, рымскіх пап, і клерыкальна-палітычнай сітуацыі ў Еўропе. Ідэйны пачынальнік мастацтва барока – вялікі скульптар, архітэктар, мастак і паэт Мікеланджэла, які па-новаму злучыў гатычную лацінскую крыжовую базіліку з магутным рэнесансным купалам-ратондай. Ідэалагічная контррэфармацыйная праграма ордэна езуітаў, зацверджаная Трыдзенскім саборам 1562 г., знайшла ўвасабленне ў стварэнні строгага архітэктурна-мастацкага і тэалагічнага канона каталіцкай царквы – барочнай крыжова-купальнай базілікі. Кананічным узорам стаў галоўны храм езуіцкага ордэна – сабор Іль Джэзу ў Рыме (1568–1584 гг.), стваральнікамі якога былі архітэктары Джакома Бароцы да Віньёла і Джакома дэла Порта. У перыяд готыкі семантыка архітэктонікі заходнееўрапейскай хрысціянскай базілікі была скіравана на акцэнтацыю прысутнасці ў саборы “Боскага святла”, але купал на сяродкрыжжы адсутнічаў. Сакральная семантыка сабораў барока заснавана на галоўнай хрысціянскай ідэі Распяцця (лацінскі крыж у плане) і Ўвазнясення Хрыста (купал-Неба). Высокія

PolotskSU



лёгкія нервюрныя скляпенні готыкі замянілі важкія цыліндрычныя скляпенні на падпружных арках і магутных апорах. Адназначную "яснасць і гармонію" архітэктуры рэнесанса замянілі шматпланавасць і тэатралізаванасць барока. Адчувальная ў творах гэтага стылю напружнае супрацьборства масы матэрыялу і пластычнасці формаў трактавана як барацьба матэрыі і духу.

У стварэнні новага мастацкага вобраза архітэктура барока ўзяла на ўзбраенне цэлы арсенал наватарскіх выразных сродкаў: разгортванне архітэктурнага аб'екта ў прасторы і часе, аптычная карэкціроўка ўспрыняцця архітэктурных формаў, стварэнне шматпланавых ракурсаў, фасадаў-куліс з цэнтральна-восевай люстэркавай сіметрыяй, новая трактоўка архітэктурнага ордэра з іншым рытмам і субардынацыяй яго частак, маляўнічасць і пластычнасць дэкаратыўных элементаў, святлоценявыя эфекты, шматколернасць і разнастайнасць фактур будаўнічых і апрацовачных матэрыялаў і інш. Асобныя часткі барочнай архітэктурнай кампазіцыі не самадастатковыя, а падпарадкаваныя агульнай задуме. Архітэктурны ордэр у барока выкарыстоўваецца як дэкаратыўна-мастацкі сродак, з пульсуючым зменлівым рытмам і вытанчанымі прапорцыямі, каб стварыць адчуванне дысанансу і экстатычнасці. Сакральнаму інтэр'еру надаецца ілюзорная бязмежнасць, неакрэсленасць, адухоўленасць з дапамогай багацейшага сінтэзу мастацтваў: манументальнага жывапісу, скульптурнай пластыкі, прадметаў культавага начыння, музыкі, містычных паратэатральных дзеянняў.

У Каронннай Польшчы ордэн езуітаў пачаў сваю дзейнасць у 1555 г. У сталіцы Вялікага Княства Літоўскага Вільні ордэн з'явіўся ў 1569 г., у год заключэння Люблінскай уніі, але папярэднічаў ёй. Гэтыя падзеі адкрылі шляхі ідэям контррэфармацыі, спрыялі звароту сацыяльнай эліты да рэлігійна-ідэалагічнай дактрыны каталіцызма. з гэтымі абставінамі непасрэдна звязана пранікненне ў культурнае жыццё Вялікага Княства Літоўскага толькі што ўзнікшага перад гэтым у Італіі архітэктурна-мастацкага стылю барока. Ён прыйшоў на беларускія землі якраз у формах прафесійнага сакральнага дойлідства і праз іх увайшоў у самыя шырокія сферы сацыяльнага быцця і нацыянальнага мастацтва ва ўсіх яго відах і жанрах. Наступныя місіі езуітаў з'явіліся ў ВКЛ ужо на тэрыторыі ўласна Беларусі: у Полацку (1579 г.) і Нясвіжы (1582 г.). Намаганнямі 1-га ардыната нясвіжскага князя М.К. Радзівіла Сіроткі і італьянскага архітэктара-езуіта Д.М. Бернадоні ў 1587–1593 гг. быў змураваны велічны касцёл Божага Цела, які стаў першым творам архітэктуры барока на тэрыторыі ўсёй Цэнтральна-Усходняй Еўропы. з яго ўзвядзеннем звязана з'яўленне ў тутэйшай будаўнічай практыцы праектнага чарцяжа – важны крок не толькі ў сферы тэхнічных і мастацкіх магчымасцей архітэктуры.

Па сваёй архітэктоніцы нясвіжскі касцёл езуітаў – 3-нефавая 6-слуповая крыжова-купальная базіліка з планам у верхнім сячэнні (пад купалам) у выглядзе выцягнутага лацінскага крыжа. Прынцыпова новая для айчыннага дойлідства структура сабора, у якой узаемна звязаны канструкцыйныя, кампазіцыйныя і семантычныя аспекты, дазваляла не толькі тэхнічна ўдасканаліць статыку будаўнічых канструкцый, стварыць новыя аб'ёмна-прасторавыя суадносіны, але і выявіць на сімвалічнай мове архітэктурных формаў пэўную ідэалагічную праграму. Асаблівае значэнне атрымліваў купал храма, які фарміраваў сілуэтную панараму ўсяго горада. На чарцяжы купал паказаны паўсферычным [4], у натуры ён набыў узнёслыя барочныя формы. Ёсць меркаванне, што пры будаўніцтве Бернардоні карыстаўся дапамогай архітэктара Джузеппе Брызіа, спецыяліста па ўзвядзенню купалоў, які быў запрошаны ў Нясвіж з Падуі ў студзені 1592 г. Падкупальны квадрат сфарміраваны чатырма магутнымі падпружнымі аркамі, якія з дапамогай ветразяў падтрымліваюць барабан купала дыяметрам каля 10 м. Пралёт цэнтральнага нефа перакрыты цыліндрычным скляпеннем, але падпружныя аркі на ім адсутнічаюць, як і ў саборы Іль Джэзу. Аднак, параўнаўчы аналіз першых збудаваннях стылю барока Італіі і Рэчы Паспалітай дае падставы сцвярджаць, што нясвіжскі касцёл Божага Цела вызначаецца цэлым шэрагам канструкцыйных і кампазіцыйных адметнасцей у трактоўцы архітэктурнага ордэрнага дэкора, наяўнасцю рыс мясцовага дойлідства папярэдняга перыяду і больш актыўнай роллю ў горадабудаўнічай сітуацыі.

На мяжы XVI–XVII стст. палітыку пратэкцыянізму на карысць ордэна езуітаў актыўна ажыццяўлялі манархі Рэчы Паспалітай Стэфан Баторы і Жыгімонт III Ваза, а таксама буйнейшыя магнаты ВКЛ [5]. У 1596–1609 гг. езуіты пабудавалі мураваны касцёл св. Казіміра ў Вільні, пры будаўніцтве адбылося абрушэнне купала. Мясцовы клімат з вялікай колькасцю ападкаў і тэхналогія муроўкі з цэглы не спрыялі ўзвядзенню ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікіх купалоў. У 1619 г. генерал ордэна Матэус Віцэлескі, паводле заключэння правінцыяла Яна Паўла Кампана, забараніў узводзіць купалы над езуіцкімі святынямі Літоўскай правінцыі. Паслядоўна рэзідэнцыі езуітаў абаснаваліся ў Брэсце, Оршы, Гродна і іншых буйных гарадах Беларусі, дзе ў хуткім часе яны распачыналі будаўніцтва касцёлаў і калегіумаў. Аднак амаль усе ўзведзеныя ў перыяд ранняга барока збудаванні езуітаў, за выключэннем Нясвіжа, былі драўляныя і цалкам знішчаны падчас руска-шведска-польскай вайны сярэдзіны XVII ст. Пасля Андрусоўскага замірэння 1667 г. пачалося будаўніцтва новых мураваных комплексаў, у выніку чаго большасць ацалеўшых і вядомых помнікаў езуіцкага храмабудаўніцтва прыпадае менавіта на перыяд сталага і позняга барока.

У дапамогу актыўнаму храмабудаўніцтву ордэна ў 1678 г. у Познані быў выдадзены на лацінскай мове архітэктурны трактат, напісаны Барталамеем Натаніэлем Вансоўскім, рэктарам мясцовай калегіі езуітаў [6]. У сваёй працы ён вызначае эстэтычныя прынцыпы ўласцівыя барока, высоўвае на першае месца патрабаванні прыгажосці і зручнасці, прадстаўляе ўзоры выкарыстання ордэрнай сістэмы як "пяць спосабаў хараства". Дасканаласць архітэктонікі знаходзіцца, на думку аўтара, у прыгажосці чалавечага цела, грунтуецца на прапорцыях чалавека. Трактат дапаўняўся добра ілюстраванымі табліцамі, на якіх прадстаўлены калоны чатырох ордэраў у барочнай інтэрпрытацыі. Вансоўскі ўжывае мясцовую будаўнічую тэрміналогію на лацінскай і польскай мовах. У цэлым трактат уяўляе кампіляцыю палажэнняў з Вітрувія, Паладзіа, Серліа і Скамоцы, якімі павінна было кіравацца класічнае "езуіцкае" барока. Але ў "рыцарскія" часы праўлення караля Яна III Сабескага "рымская" заангажаванасць і праграмнасць арыстакратычнага мастацтва езуітаў мусіла суіснаваць з магутнай плынню "сармацкага" барока, увасобленага ў сакральным дойлідстве жабрацкіх ордэнаў. з імі, асабліва з ордэнам дамініканцаў, езуіты сапернічалі ў сацыяльна-эканамічных адносінах, сферах уплыву і асветніцка-тэалагічнай дзейнасці. Гэта прывяло да пэўнага размежавання і адначасова ўзаемадзеяння архітэктурна-мастацкіх сродкаў "езуіцкага" і "сармацкага" барока, што і надало адметнасць стылявой эвалюцыі беларускага дойлідства апошняй трэці 17 – 1-й трэці 18 ст.

У Брэсце езуіты з'явіліся ў 1609 г., а ў 1622 г. яны пачалі будаваць драўляны касцёл. У "Інвентары люстрацыйным брэсцкай калегіі езуітаў" за 1773–1774 гг. прыводзіцца запіс, што "року 1623 месяца июня 17 дня" ад Льва Сапегі, ваяводы віленскага, старосты магілёўскага на ўфундаванне "калегіі і школы езуіцкай для адукацыі млодзі" [7]. У 1656 г. яго сын К.-Л.Сапега пакінуў у спадчыну брэсцкім езуітам яшчэ 30 тысяч злотых на будаўніцтва мураваных касцёла і калегіума. Час будаўніцтва комплекса прыпадае на перыяд паміж 1665 і 1692 гг. Пры будаўніцтве ў 1840-я гг. у Брэсце ваеннай крэпасці касцёл быў разбураны, а калегіум часткова прыстасаваны пад казармы. Комплекс вядомы паводле абмерных чарцяжоў [8]. Архітэктоніка брэсцкага касцёла, асвечанага пад тытулам Ісуса і Св.Крыжа, была класічная для езуіцкага храмабудаўніцтва: 3-нефавая крыжова-купальная базіліка з прамавугольным планам. Роўнавысокія і роўнашырокія цэнтральны неф і трансепт

PolotskSU



у верхнім сячэнні ўтваралі выцягнуты лацінскі крыж. Прыведзены люстрацыйны інвентар паведамляе, што "касцёл мураваны, у даўжыню каля 70 крокаў у сабе мае, на філярах і аркадах, з дахам пад гонтам, патрабуе рэпарацыі... купал мае 1 дужы, драўляны, на самым сродку касцёла з сігнатуркай, белай бляхай пакрыты". Над паўднёвай закрыстыяй размяшчаліся эмпоры ("хорак з вокнамі"), з другога боку – "ізба з комінам і печам зялёным, а на версе скарбец" [9]. У дэкаратыўным аздабленні фасада быў выкарыстаны карынфскі ордэр. Унутры касцёл меў падлогу з прывезенага шведскага каменю, алтары, амбон, арганныя хоры, канфесіяналы выдатнай "сніцарскай" работы і крыпту з ганаровымі пахаваннямі.

Рэзідэнцыя езуітаў у Гродне заснавана ў 1622 г. С.Касабуцкім і першапачаткова мела драўляны касцёл. Паводле А. Кіркора, будаўніцтва мураванага касцёла пачалося ў 1647 г, было прыпынена акупацыяй Гродна маскоўскімі войскамі ў 1656–1662 гг., а завершана да 1667 г., калі адбылася яго кансекрацыя біскупам Ф. Ісайкоўскім. Гэтыя звесткі абвергнуты Е. Пашэндам [10] на падставе гісторыі гродзенскага калегіума за 1673—1769 гг., што захоўваецца ў Рымскім архіве езуітаў. Краевугольны камень існага касцёла асвечаны ў 1678 г. біскупам М. Слупскім. Будаўніцтвам гродзенскага касцёла езуітаў да 1683 г. кіраваў ксёндз Г. Дзевялтоўскі. У 1684–1697 гг. будаўнічыя работы ўзначаліў ксёндз П. Алізаровіч. У 1701–1702 гг. былі накрытыя вежы на галоўным фасадзе ў іх першапачатковым варыянце, які вядомы з абраза, што знаходзіцца ў касцёле. 6 снежня 1705 г. гродзенскі касцёл езуітаў быў кансекраваны ў гонар св. Францыска Ксаверыя біскупам хелмінскім Т.Патоцкім у прысутнасці караля Аўгуста ІІ і цара Пятра І.

Аўтэнтычная архітэктоніка гродзенскага касцёла езуітаў адпавядае этапу сталага барока ў беларускім сакральным дойлідстве. Яна ўвасабляе канон езуіцкага храмабудаўніцтва: 3-нефавая крыжова-купальная базіліка, якая ў ніжнім сячэнні мае прамавугольны план, а ў верхнім сячэнні – ярка выяўлены лацінскі крыж. Роўныя па вышыні і шырыні цэнтральны неф і трансепт перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі на адзіночных падпружных арках і ўтвараюць сяродкрыжжа, увенчаная круглым светлавым барабанам з паўсферычным купалам на ветразях. Па баках прэсбітэрыя размешчаны квадратныя ў плане капліцы, перакрытыя паўсферычнымі светлавымі купаламі. з выявы гродзенскаг касцёла езуітаў на абразе пачатку 18 ст. відавочна, што ў аўтэнтычным выглядзе яго галоўны фасад быў вельмі блізкі да адначасовых мясцовых помнікаў "сармацкага" барока: тыя ж амаль прызматычныя чацверыковыя вежы, завершаныя шатрамі-"каўпакамі" з банькамі, і плоскасны ордэрны дэкор. Адметны па сваёй стылістыцы верхні чацвёрты ярус вежаў надбудаваны ў 1750–1752 гг., ужо ў часы позняга барока. Існуе будаўнічы кантракт, без даты, заключаны з "майстрам куншту мулярскага" Хрысціянам Бурманам, які браўся надбудаваць вежы касцёла "паводле мадэлі і абрысу", а на купале замест драўлянага ўзвесці мураваны ліхтар і інш. [11]. Паўночная вайна затрымала працяг будаўнічых работ. Аздабленне інтэр'ера пачалося ў 1711 г. і цягнулася працяглы час. Велічны галоўны алтар, вышынёю 21 м, выкананы па фундацыі кашталяна мсціслаўскага С. Лазавога і яго жонкі Канстанцыі "обермайстрам разьбярскім" Янам Шмітам. У "Люстрацыі касцёла Гродзенскіх езуітаў пад тытулам св. Францыска Ксаверыя, езуіцкага апостала", складзенай 1 лістапада 1773 г. [12], пазначана, што ў ніжнім ярусе галоўнага алтара "у сярэдзіне статуя св. Ксаверыя, па баках 10 апосталаў, на рагах 2 генія з гербамі фундатараў. У другой кандыгнацыі статуя Ісуса, па баках 4 евангелісты, 2 патрыярха, 2 біскупа". Уся кампазіцыя завершана "Глорыяй", перад якой схіляюць галовы алегорыі 4 бакоў свету ў абліччы жанчын. Усяго ў святыні 12 бакавых алтароў. Крыху пазней былі створаны амбон у стылі ракако і канфесіяналы (майстар І. Мейфельдт, 1768 г.). У інтэр'еры прысутнічаюць элементы мастацкага аздаблення і больш позняга часу. У сваёй мастацкай сукупнасці, як пазначана ў хроніцы езуітаў, гродзенскі касцёл св.Францыска Ксаверыя ёсць "найшляхетнейшая базіліка", "найвыбінейшая сярод найслаўнейшых святынь каралеўства".

Да захоняга рэгіёна Беларусі належыць касцёл езуітаў у Навагрудку, які заснаваў ў 1714 г. харунжы наваградскі Юры Галаўня. Будынак быў моцна пашкоджаны ў 1-ю сусветную вайну, у 1930-я гг. вялася яго рэстаўрацыя. На сённяшні дзень захаваліся фрагменты падмуркаў. Касцёл меў на фасадзе 2 вежы, крытыя меддзю, перад фасадам "крухту мураваную, дахаўкай крытую", унутры падлогу мармуровую, алтары з "гіпсавай аздобай на муре" і амбон добрай "сніцарскай работы". Сцены і скляпенні ўпрыгожвалі фрэскавыя роспісы [13].

Паўночны полацка-віцебскі рэгіён быў адносна блізкі да сталіцы дзяржавы – Вільні – і больш за іншыя рэгіёны знаходзіўся пад яе культурным уплывам. Рэзідэнцыя езуітаў у Полацку заснавана ў 1579 г., другой па часе пасля Вільні на тэрыторыі ВКЛ і першай на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Роля Полацка ў гісторыі гэтага ордэна унікальная – ён стаў не толькі першым, але і апошнім яго прытулкам на беларускіх землях. Калі ў 1773 г. булай папы Кліменція XIV ордэн езуітаў быў скасаваны, што адбылося праз год пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай, Кацярына ІІ, насуперак папскай буле, вырашыла захаваць ордэн у сваёй дзяржаве, і цэнтрам яго знаходжання стаў Полацк, які ўвайшоў у склад Расійскай імперыі. Першыя драўляныя будынкі касцёла і калегіума пачалі будаваць на высокім правым беразе ракі, непадалёку ад Сафійскага сабора, паміж Верхнім замкам і рынкавай плошчай горада, пра што сведчыць адпаведная каралеўская грамата [14]. У XVII ст. драўляны комплекс калегіума езуітаў у Полацку неаднаразова цярпеў ад пажараў. У канцы стагоддзя было распачата ўзвядзенне мураванага касцёла паводле праекта італьянскага дойліда. Вядома, што купал узводзіў мясцовы архітэктар-езуіт Габрыэль Лянкевіч [15, с.131]. Будаўніцтва святыні ў асноўным завершана ў 1738 г., 15 жніўня 1745 г. яна кансекравана ў гонар Звеставання Найсвяцейшай Дзеве Марыі і св. Стэфана, нябеснага патрона караля-заснавальніка Стэфана Баторыя, але аздабленне інтэр'ера працягвалася да 1766 г. [16]. На час будаўніцтва касцёла прыпадае ўдзел у ім і выкладанне ў калегіуме вядомых архітэктараў-езуітаў: У. Дзягілевіча (1695–1698), Р. Энгела (1698–1699), К. Мацелякоўскага (1705–1710 і 1733–1735), муляра Б. Мезера (1735–1738) і пазней – М. Пачобута-Адляніцкага (1748–1753), Я. Алендзкага (1759–1760), Б. Шляхты (1760–1762), А. Жаброўскага (1766–1769) і інш. [17, с.248–249]. Відавочна, што пры наяўнасці такіх шматлікіх і высокакваліфікаваных кадраў, будаўніцтва касцёла і калегіума ажыццяўлялася мясцовымі майстрамі і праектантамі. У стварэнні галоўнага алтара прымаў удзел мастак С.Чаховіч, над сніцарскім аздабленнем інтэр'ера працавалі разьбяры А. Лазуровіч і Т. Быковіч. Арган касцёла ў 1765–1766 гг. зрабіў італьянскі майстар Д.А. Касперыні. У 1750 г. на месцы знішчанага пажарам драўлянага калегіума пачалі мураваць новы грандыёзны комплекс, які, разам з касцёлам, стварыў велічны архітэктурны ансамбль, будаўніцтва якога ішло ў некалькі этапаў.

Магутная 3-нефавая крыжова-купальная базіліка касцёла св. Стэфана з велічным 2-вежавым фасадам-нартэксам мела значныя памеры (24 х 47 м у плане і вышыня вежаў – 60 м). У верхнім сячэнні выразна выяўлены лацінскі крыж, пры гэтым крылы трансепта злёгку выступаюць за межы прамавугольнага плана базілікі. Алтарнае завяршэнне цэнтральнага нефа мае прамавугольны абрыс і арыентавана на захад, да Рыма. Абапал алтарнай часткі сіметрычна размяшчаны прасторныя маршавыя лесвіцы, што дазваляе ім злучаць адначасова як паверхі калегіума, так і сакрыстыі храма.

PolotskSU



Сяродкрыжжа полацкага касцёла езуітаў было ўвенчана барочным купалам на гранёным барабане. Абмерныя чарцяжы комплекса выкананы ў 1793 г. [18] і 1833 г. [19], пры перабудове касцёла св. Стэфана пад Мікалаеўскі сабор у стылі позняга класіцызму (арх. А. Порта). У аўтэнтычным абліччы полацкага касцёла езуітаў можна назіраць пэўныя рысы “сармацкага” барока, але яго формы вызначаюцца большай вытанчанасцю і экспрэсіяй. Першае гарызантальнае сячэнне фасада, зробленае на ўзроўні карніза цэнтральнага нефа, надавала прапорцыям ордэра надзвычайную выцягнутасць і вертыкалізм, што яшчэ больш падкрэслівала тэлескапічная будова верхніх ярусаў вежаў. У адной з іх знаходзіліся званы, у другой – унікальны гадзіннік работы віленскага майстра Густава Мудні. Моцная горабудаўнічая актыўнасць каталіцкай святыні стала прычынай таго, што ў 1936 г. вежы разабралі. У студзені 1964 г. касцёл св. Стэфана і часткова калегіум былі ўзарваны [20].

У лютым 1784 г. у Полацк прыехаў прафесар архітэктуры Габрыэль Грубер, славенец па паходжанню, які з 1785 г. выконваў абавязкі кіраўніка ордэна. Ён валодаў многімі еўрапейскімі мовамі і шырокім спектрам гуманітарных і прыродазнаўчых навук: філасофіяй, тэалогіяй, матэматыкай, фізікай, астраноміяй, медыцынай, быў выдатным мастаком і дасведчаным архітэктарам. Па яго праекту быў пабудаваны новы корпус калегіума, дзе месцілася пінакатэка, аздобленая фрэскамі работы Г. Грубера, музей, хімічная лабараторыя, абсерваторыя і навуковыя кабінеты (фізічны, натуральнай гісторыі, мінералагічны, этнаграфічны і інш.). з полацкім езуіцкім калегіумам звязаны пачатак прафесійнай архітэктурнай адукацыі ў Беларусі: тут функцыянавалі 2 факультэты цывільнай і ваеннай архітэктуры, дзе ў 1802 г. навучалася 40 чалавек. На базе калегіума ў 1812 г. створана Полацкая езуіцкая акадэмія, якая існавала да 1820 г. У 1800 г. Г.Грубер стаў першым рэктарам езуіцкага калегіума ў Пецярбургу. Ён меў уплыў на расійскага імператара Паўла I, пры пасрэдніцтве якога ў 1802 г. атрымаў ад папы рымскага Пія VII афіцыйнае прызнанне ордэна езуітаў у межах Расійскай імперыі, быў абраны генералам ордэна. У 1814 г. папскай булай дзейнасць ордэна была адноўлена паўсюдна.

У Віцебску езуіты аселі ў 1637 г. У 1640–1644 гг. коштам смаленскага ваяводы А. Корвін-Гансеўскага быў узведзены першы драўляны касцёл езуітаў, асвечаны ў гонар св. Іосіфа Абручніка [21]. У 1654–1655гг. ён перабудоўваецца пад праваслаўную царкву Аляксееўскага манастыра, вядомы па чарцяжы Віцебска 1664 г. і інвентары 1704 г. У 1708 г. падчас пажару Віцебска згарэлі драўляныя будынкі калегіума езуітаў. У 1716 г. на сродкі гарадскога кашталяна М.Агінскага і віцебскай шляхты езуіты пачалі будаваць мураваны комплекс касцёла і калегіума. Да 1765 г. кіраўніком будоўлі з’яўляўся Базыль Часновіч. Велічная 3-нефавая крыжова-купальная базіліка з 2-вежавым фасадам-нартэксам у стылі віленскага барока была завершана ў асноўным да 1731 г., а кансекравана ў 1751 г. [21]. Іосіфаўскі касцёл езуітаў у першапачатковым варыянце меў шмат агульнага з крыху больш познім бернардзінскім касцёлам св. Антонія ў Віцебску, пабудаваным у 1737–1755 г. Атрыбутыўна абодва помнікі мы адносім да аўтарства арх. Іосіфа Фантаны ІІІ. Будаўніцтва калегіума працягвалася да 1799 г. і закончана ўжо пасля раздзелаў Рэчы Паспалітай. У 1822–1839 гг. ён часова належаў базыльянскаму ордэну. Пасля забароны уніяцтва, у 1843 г. комплекс быў перададзены праваслаўным, а касцёл перабудаваны ў стылі позняга класіцызма і перайменаваны ў Мікалаеўскі сабор. Фігурныя завяршэнні вежаў і цэнтральны барочны купал замянілі на паўсферычныя купалы, а над гадзіннікавай вежай з’явіўся высокі ампірны шпіль. У 1872 г. гэтую вежу разабралі, а вежы на фасадзе касцёла перабудавалі ў псеўдарускім стылі. Храм знішчаны ў 1956 г.

Рэзідэнцыя езуітаў у Оршы з’явілася ў 1604 ці 1612 г. па прывілею караля Жыгімонта ІІІ Вазы [22, с.198]. Фундацыю першых драўляных будынкаў калегіума езуітаў ажыццявіў Л.Сапега, які купіў для іх пляц, дзе раней размяшчаўся кальвінскі збор. Узвядзенне мураванага комплекса пачалося ў 1690 г. па прывілею і на сродкі караля Яна ІІІ Сабескага. Будаўніцтва касцёла вялося вельмі марудна і толькі ў 1760 г. ён "стаў у камені", а ў 1768 г. кансекраваны ў гонар Міхаіла Архангела, у 1788 г. драўляныя алтары заменены на мураваныя і стукавыя. Толькі ў 1803 г. завершана будаўніцтва калегіума, але ўжо ў 1840-х гг. касцёл быў разбураны. Уяўленне пра яго даюць абмерныя чарцяжы 1835 г. [23]. Будынак касцёла ўяўляў 3-нефавую крыжова-купальную базіліку з планам у верхнім сячэнні ў выглядзе лацінскага крыжа. На абмерных чарцяжах 1835 г. купал на сяродкрыжжы адсутнічае, але ў візіце 1817 г. адзначана, што купал ёсць, але "не мае вокнаў і не шмат перавышае дах касцёла" [24]. У стылістыцы аршанскі касцёл езуітаў меў пэўныя рысы "сармацкага" барока, але ў яго семантыцы адлюстравана ідэалагічная праграмнасць "езуіцкага" барока.

Найбольш познім помнікам езуіцкага храмабудаўніцтва паўночнага рэгіёна Беларусі з’яўляецца касцёл св.Тадэвуша ў в.Лучай (Пастаўскі р-н), закладзены ў 1766 г. па фундацыі Т. і Э. Агінскіх, асвечаны ў 1777 г. віленскім біскупам Ф. Тавяньскім. Гэта 3-нефавая крыжова-купальная базіліка з 2-вежавым фасадам-нартэксам. Пры гэтым купал на сяродкрыжжы схаваны ў канструкцыі двухсхільных дахаў і звонку не выяўлены. У інтэр’еры паверхня сцен і скляпенняў дэкарыравана фрэскавай размалёўкай у тэхніцы "грызайль", якая імітуе скульптурную лепку і архітэктурны стафаж. Сухаватая рацыянальнасць кананічнай кампазіцыі гэтай езуіцкай базілікі, выкарыстанне ў дэкаратыўнай пластыцы вялікага дарычнага ордэра, характэрнага для класіцызму, важкаватасць вянчальных мас збудавання сведчаць пра пераход да новай плыні так званага барочнага класіцызму, звязанага з эпохай Асветніцтва ў Заходняй Еўропе. Аўтарства лучайскага касцёла езуітаў звязваюць з архітэктарам-езуітам гэтага перыяду Т.Жаброўскім.

Характэрнай рысай езуіцкага храмабудаўніцтва канца XVII–XVIII стст. цэнтральнага, усходняга і паўднёвага рэгіёнаў Беларусі з’явіўся адыход ад кананічнай крыжова-купальнай схемы. Амаль адначасова з гродзенскім касцёлам езуітаў узведзены мураваныя святыні таго ж ордэна ў Мінску і Магілёве. Але тут замест класічнай праграмнай 3-нефавай крыжова-купальнай базілікі з планам у верхнім сячэнні ў выглядзе лацінскага крыжа, пабудаваны класічныя 3-нефавыя базілікі без трансептаў і купалоў.

Езуіты аселі ў Мінску ў 1654 г. па фундацыі смаленскага біскупа Г. Сангушкі, які набыў для іх рэзідэнцыі мураваную сядзібу на вуглу вуліцы Койданаўскай і Высокага рынку з драўлянай капліцай. Толькі 24 красавіка 1700 г. ва ўрачыстай абстаноўцы быў асвечаны краевугольны камень новага мураванага касцёла, будаўніцтва якога вялося даволі хуткімі тэмпамі: скляпенні і дах узведзены ўжо ў 1705 г. Храм асвечаны пад тытулам Ісуса, Дзевы Марыі і св. Барбары 16 красавіка 1710 г. біскупам Ц.-П. Бжастоўскім [25, с.165]. Вядома, што ў 1698–1699 гг. у мінскай рэзідэнцыі выкладаў архітэктар Уладзіслаў Дзягілевіч, беларус, манах ордэна з 1691 г., з 1710 г. быў суперпрыёрам у Мсціславе, дзе адначасова кіраваў будаўніцтвам. Дабудова мінскага касцёла працягвалася яшчэ доўгі час. У 1719 і 1722 гг. да вімы прэсбітэрыя былі далучаны квадратныя ў плане капліцы Св. Тройцы і св. Феліцыяна (фундацыі роду Завішаў). Імёны архітэктараў-езуітаў, што ўдзельнічалі ў дэкаратыўным аздабленні святыні ў 2-й палове 18 ст.: Францішак Карэва (1763–1764), Базыль Шляхта (1767–1768), Андрэй Жаброўскі (1769–1771). У 1773 г. касцёл стаў парафіяльным, з 1789 г. па 1869 г. – катэдральным. У яго

PolotskSU



рэканструкцыі прымаў удзел мінскі губернскі архітэктар К. Хршчановіч. У 1948–1951 гг. касцёл рэканструяваны, у 1990-я гг. адноўлены як катэдральны сабор Мінска-Магілёўскай Архідыяцэзіі.

Архітэктоніка мінскага касцёла езуітаў, паўтараючы ў асноўным структуру папярэдніх мураваных святынь горада, магчыма ўпершыню ў храмабудаўніцтве ордэна ў ВКЛ парушае іх устойлівую ідэалагічна-праграмную схему. Будынак касцёла ўяўляе 3-нефавую базіліку без трансепта, з больш вузкай і нізкай за цэнтральны неф апсідай прэсбітэрыя, у чым нельга не адзначыць водгук мясцовага рэнесанса. Дынаміка кампазіцыі традыцыйна нарастае ад больш нізкіх аб’ёмаў алтарнай часткі да 2-вежавай пласціны галоўнага фасада-нартэкса. Будаўніцтва верхніх ярусаў вежаў завершана ў 1730–1732 гг. Відавочна, што ў той жа час створаны познебарочны франтон-"дыядэма" над алтарнай часткай. Экспрэсія форм паступова нарастае ўгору і выяўляецца ў дынамічных вертыкалях вежаў. Спалучэнне слаістых пілястраў з сакавітым аб’ёмным вырашэннем цэнтральнай часткі галоўнага фасада з’яўляецца прыкметай віленскага барока. Адметнасць інтэр’еру святыні надае незвычайны малюнак антаблемента, што апярэзвае цэнтральны неф. Міжнефавыя аркады раскрапаваны пілястрамі карынфскага ордэра, якія завяршалі барочныя скульптуры 12 апосталаў.

Архітэктоніку блізкую да мінскага касцёла езуітаў меў касцёл таго ж ордэна ў Магілёве, дзе езуіты з’явіліся ў 1678 г. і спачатку мелі драўляныя касцёл і калегіум. Мураваны калегіум пачалі будаваць у 1686 г., падмурак касцёла закладзены ў 1699 г. [26], муры ўзведзены да 1723 г., вежы завершаны яшчэ пазней [27]. Святыня кансекравана ў 1725 г. у гонар св.Францыска Ксаверыя і святых Анёлаў-ахоўнікаў. Будаўніцтва ўсяго комплекса працягвалася да 1820 г. з ім звязаны імёны архітэктараў-езуітаў: Язэпа Алендзкага (1756–1757), прафесара матэматыкі Войцеха Абранпольскага (1786–1796) і інш. [17, с.244]. У 1833 г. касцёл быў перароблены пад праваслаўную Васкрасенскую царкву, а ў ХХ ст. цалкам знішчаны. Храм уяўляў 3-нефавую базіліку без трансепта з 2-вежавым фасадам-нартэксам. Купал адсутнічаў, пра што сведчыць малюнак І. Пешкі і абмерныя чарцяжы пачатку 19 ст.[28]. У 1848 г. надбудаваны несапраўдны купал, які даволі ўдала паўтараў барочныя завяршэнні строгіх чацверыковых вежаў.

Спецыфічную архітэктоніку, якая ўяўляла творчы сімбіёз праграмнай тэмы езуіцкага будаўніцтва (лацінскага крыжа) і тэндэнцыі да змяншэння ролі трансепта меў езуіцкі касцёл у Мсціславе, які ў комплексе з калегіумам існаваў тут з 1690 па 1820 гг. Мураваны касцёл Міхаіла Архангела ўзведзены ў 1730−1739 гг. па фундацыі старосты мсціслаўскага Ю. Галынскага і інш. з яго будаўніцтвам звязаны імёны архітэктараў У. Дзягілевіча (1700–1714), Я. Алендзкага (1754–1755), Б. Шляхты (1762–1764), прафесароў архітэктуры А. Абрамсперга, В. Абранпольскага, М. Скакоўскага (канец XVIII ст.). У плане збудавання сфарміраваны лацінскі крыж, але падкупальны квадрат і купал тут адсутнічаюць. У 1832 г. будынкі калегіума езуітаў у Мсціславе перададзены праваслаўнаму Тупічэўскаму манастыру. У 1836 г. распрацаваны праект рэканструкцыі касцёла пад Мікалаеўскі сабор, паводле якога над дахам надбудаваны паўсферычны купал на круглым барабане і невялікія паўсферычныя купалы над вежамі, што надало збудаванню рысы посткласіцызму [29].

Да групы езуіцкіх 3-нефавых базілік без трансепта цэнтральна-ўсходняга рэгіёна належыць касцёл у Бабруйску фундаваны ў 1615 г. старостам бабруйскім П. Трызнам, які ў 1625 г. "асадзіў пры ім айцоў-езуітаў" [25, с.251]. На працягу існавання тут езуіцкай калегіі (1625–1773) з ёй звязаны імёны архітэктараў: У. Дзягілевіча (1699–1700), К. Мацелякоўскага (1735–36), Т. Жаброўскага (1746), Г. Лянкевіча (1747–48) і Ф. Карэва (1757–58). Час будаўніцтва мураванага касцёла ў стылі позняга барока акрэслены ўдзелам у ім муляра Якуба Руофа (1732–1747). "Люстрацыйны інвентар касцёла Бабруйскай калегіі езуітаў" паведамляе: "Касцёл мураваны на тракце, па вуліцы Вялікай... фронт касцёла з 2 вежамі з муру высока ўзнесены, паміж якім фацыята мурованая, на якой кружганак драўляны з балясамі стары. На вежах купалы пакрыты бляхай белай з кружганкамі вакол, крыжы з ветракамі. У тых купалах з аднаго боку гадзіннік з боем, а на другім баку матэматычны компас, унутры званы... У фрамугах тых вежаў статуі драўляныя на пастаментах мураваных св. Ігнація, св. Бергіяша, св. Ксаверыя і св. Станіслава..." [30]. Пры ўваходзе месціўся "хор мураваны на 2 філярах са сходамі з абодвух бакоў". Галоўны алтар, які ўключаў 8 познебарочных скульптур святых, 6 бакавых алтароў, амбон − усё сакральнае начынне інтэр’ера было драўлянае, добрай "сніцарскай работы" майстроў Я. Шылы і А. Марціноўскага. Сцэны былі распісаны "al fresko", а сярод абразоў знаходзіліся "сармацкія" данатарскія партрэты караля Жыгімонта III Вазы і П.Трызны. Пры будаўніцтве ў першай палове XIX ст. бабруйскай ваеннай крэпасці былы езуіцкі касцёл перабудаваны пад цэйхгаўз.

Яшчэ адну групу помнікаў езуіцкага храмабудаўніцтва можна вызначыць як паўднёвую ці палескую. Рэзідэнцыія ордэна езуітаў у мястэчку Крывошын (Ляхавіцкі р-н) асаджана ў 1620 г. пры драўляным касцёле, фундаваным у 1588 г. біскупам віленскім Ю. Радзівілам [31]. Мураваны касцёл пабудаваны па адных крыніцах у 1679 г., па другіх − у 1740 г., што больш верагодна паводле яго стылявых характарыстык. Мураваны галоўны алтар, дзе месціўся цудатворны абраз Маці Божай Крывошынскай, выкананы па фундацыі ксяндза М. Кяршкоўскага. У 1863 г. касцёл рэканструяваны [32] пад праваслаўную Пакроўскую царкву ў псеўдарускім стылі. Пры гэтым над класічнай 3-нефавай базілікай без трансепта ўзведзены масіўны несапраўдны купал.

Першыя звесткі пра рэзідэнцыю ордэна езуітаў ў мястэчку Юравічы (Калінкавіцкі р-н) тычацца 1677–1678 гг. і звязаны з прывілеямі караля Яна III Сабескага. Спачатку пабудовы комплекса, як звычайна, былі драўляныя і знішчаны пажарам у 1705 г. Мураваны касцёл у гонар Нараджэння Дзевы Марыі ўзведзены ў 1726–1746 гг. У "Люстрацыйным інвентары Юровіцкай калегіі езуітаў” адзначана: "Касцёл вялікі, мураваны, пышны, дахоўкамі крыты, з 2 вежачкамі наперадзе..." [33]. Вежы на той час былі пакрытыя меднымі лістамі, але яшчэ незавершаныя. У 1817 г. комплекс быў перададзены бернардзінцам, у 1832 г. касцёл перароблены пад праваслаўную царкву, на сённяшні дзень знаходзіцца ў напаўразбураным стане. На абмерных чарцяжах, выкананых у 1835 г. [34], прадстаўлена прыгожая 3-нефавая базіліка без трансепта з 2-вежавым фасадам-нартэксам. Арганізацыя інтэр’ера мае выразны познебарочны характар. Ступенчаты абрыс вертыкальных апор надае цякучасць і неакрэсленасць прасторы травей, якія маюць авальны план і перакрыты авальнымі скляпеннямі. Уваходная частка нартэкса таксама мела форму авала, па баках якога месціліся вітыя ўсходы на хоры. Інтэр’ер святыні аздаблялі 9 алтароў, галоўны з якіх выкананы ў 1732 г. рэзчыкам Т. Аршыцкім і вызалачаны майстрам С. Пятроўскім.

Архітэктоніка і стылістыка касцёла езуітаў св. Станіслава ў Пінску вылучаецца сярод іншых святынь ордэна. Гісторыя яго будаўніцтва працяглая і складаная. У 1631 г. староста пінскі С.А. Радзівіл асадзіў у горадзе езуітаў, рэзідэнцыя якіх спачатку мела драўляную капліцу, у 1635 г. закладзены падмуркі мурванага касцёла, які быў асвечаны ў 1646 г., але будаўніцтва яго працягвалася. У 1651 г. пры ім, у "адпаведнасці з праектам", пачалі ўзводзіць 2-павярховы мураваны калегіум. Кіраваў будаўніцтвам "архітэктар рамяства мулярскага" Матэвуш Фалькоўскі [35]. Наяўнасць аўтографа гэтага майстра ў альбоме Бернадоні, верагодны ўдзел яго ў перабудове жодзішкаўскага кальвінскага збору пад езуіцкі касцёл

PolotskSU



св.Тадэвуша, а таксама два будаўнічыя кантракты, заключаныя ім з кіраўніцтвам пінскай калегіі, сведчаць пра яго актыўную ролю ў езуіцкім будаўніцтве сярэдзіны XVII ст. [4, арк. 3]. з кантракта, які быў падпісаны М. Фалькоўскім, разам з Рыгорам Валовічам, 7 сакавіка 1654 г., вынікае, што яны "жыхары Вільні". Вядомы таксама імёны іншых будаўнікоў комплекса таго часу: муляраў Станіслава Багдзевіча (1638–1639) і Крыштофа Стэфановіча (1653–1654). Падчас вайны сярэдзіны 17 ст. моцна пацярпеў увесь комплекс пінскай калегіі. Пасля вайны павялічваецца колькасць дакументаў і кантрактаў, звязаных з будаўніцтвам калегіума і аднаўленнем касцёла. У іх прысутнічаюць імёны "майстроў рамяства каменнага, жыхароў віленскіх" Даніэля Драздоўскага, Якуба Вайтаховіча, Яна Вінцэнта Сальвадора, "віленскага магістра", Войцэха Ярашэвіча, Балтазара Шынкера, Казіміра Пятроўскага, Яна Талкача. з канца 17 ст. і на працягу ўсяго 18 ст. у дакументах трапляецца шэраг імёнаў архітэктараў, якія вядомы па раней разгледжаных езуіцкіх помніках. У 1748–1777 гг. работы працягваў прафесар архітэктуры Матэвуш Кісялеўскі [17, с.247].

У "Люстрацыйным інвентары пінскага езуіцкага калегіума" [36] пазначана, што касцёл незавершаны пасля пажару папярэдняга і абвалу яго скляпенняў, "новы ад фундамента, у форме крыжа, вялікі і пышны", мае 2 вежы, аздоблены балкончыкам, пакрыты гонтам і меднымі лістамі. Падкрэслены таксама адметнасці святыні: "вежы гэтыя падперты 2 бакавымі скрыдламі, нанова ад фундамента, вышынёй роўна з магістрацкім мурам. Пад бакавой па правай руцэ капліцай склеп мураваны, у ім цела Баболі". У 1787 г. касцёл перароблены пад уніяцкую царкву, пасля 1795 г. – у праваслаўную. У 1956 г. касцёл цалкам знішчылі. На сённяшні дзень ацалеў толькі 3-павярховы мураваны будынак калегіума, пасля Полацка, буйнейшага на Беларусі [219, с.127–130]. Храм уяўляў сабою 3-нефавую базіліку з трансептам і паўкруглым прэсбітэрыям, роўнымі па вышыні і шырыні цэнтральнаму нефу. Унутры велічнай крыжовай кампазіцыі быў схаваны паўсферычны купал. Пазней над сяродкрыжжам надбудавалі несапраўдны барабан з цыбулепадобным верхам.

Эстэтычна-тэалагічная канцэпцыя "езуіцкага" барока з'явілася матывуючай праграмнай ідэяй развіцця хрысціянскага мастацтва ва ўсім свеце на працягу 16–18 стст. Яна арганічна адаптавалася да мясцовых культурных традыцый і падпарадкоўвалася заканамернасцям эвалюцыі стылю ў канкрэтным сацыяльна-гістарычным кантэксце. Мастацтвазнаўчы аналіз езуіцкага храмабудаўніцтва на Беларусі паказвае, што тут ордэн езуітаў рукамі мясцовых майстроў стварыў выдатныя ўзоры мастацтва барока. Сакральныя збудаванні езуітаў, захоўваючы ў асноўным кананічную схему рымскага сабора Іль Джэзу, прайшлі розныя этапы станаўлення стылю, набылі рысы нацыянальнай своеадметнасці. На гэта іх стымулявала сацыяльна-эканамічнае супрацьборства паміж канфесіямі і шэрагам каталіцкіх ордэнаў. Напачатку эпохі барока езуіты выступілі сцяганосцамі заходнееўрапейскага стылю, але на наступных этапах развіцця беларускага сакральнага дойлідства мясцовыя мастацкія плыні "сармацкага" і віленскага барока пачалі адваротна ўплываць на езуіцкае храмабудаўніцтва. У выніку яго творы сталі арганічнай часткай айчыннай культуры.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Квитницкая, Е.Д. Коллегиумы Белоруссии XVII в. / Е.Д. Квитницкая // Архитектурное наследство. – М.: Стройиздат, 1969. – № 18. – С. 3–1; Квитницкая, Е.Д. Белорусские коллегиумы XVIII в. / Е.Д. Квитницкая // Архитектурное наследство. – М. : Издательство литературы по строительству, 1972. – № 19. – С. 12–27.
2. Paszenda J. Kościoł Bożego Ciała (pojezucki) w Nieświeżu. // Kwartalnik architektury i urbanistyki. – Warszawa, 1976. Nr. 21. Zasz. 3. – s. 195–216; Paszenda J. Kościoł pojezuicki (farny w Grodnie). [w:] Kultura artystyczna Wielkiego Księstwa Litewskiego w epoce baroku. – Warszawa, 1995. – s.191 – 213; Paszenda J. Problem stylu w architekturze jezuickiej. // Biuletyn Historii Sztuki. XXIX, 1967, Nr. 2. – s. 146–156; Paszenda J. Sztuki wieleńskie XVIII wieku w świetle archiwów jezuickich. //Biuletyn Historii Sztuki. R. XXXVI, 1974. – Nr. 2. – s. 158–162; Poplatek J., Paszenda J. Słownik jezuitów artystów. – Kraków, 1972; Габрусь Т.В. Архитектурное проектирование в Беларуси. У истоков. //Строительство и архитектура Белоруссии. 1990. № 4. – С. 30–32; Галенчанка Г. Альбом Бернардоні: Новая крыніца па гісторыі архітэктуры і будаўніцтва ў Нясвіжы (канец XVI– пачатак XVIІІ ст.). //Ад Полацка і Нясвіжа да Падуі і Венецыі. – Мн., 1994. – С.79–87; Міцкевіч, В.С. Каталіцкія кляштары XVII–XVIII стст. у межах сучаснай Беларусі / В.С.Міцкевіч. – Мінск, Рымска-каталіцкая парафія Св.Сымона і Св. Алены, 2013.
3. Габрусь, Т.В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока / Т.В. Габрусь. – Мінск: Ураджай, 2001. – 288 с.
4. Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Украіны. АР, 721(589)С.
5. Baranowski, A.J. Między Rzymem a Wilnem. Magnackie fundacje sakralne w Wielkim Księstwie Litewskim w czasach kontrreformacji na tle polityki dynastycznej w Europie Srodkowej / A.J. Baranowski – Warszawa, 2006. – 331 s.
6. Mieszkowski, Z. Podstawowe problemy architektury w traktatach polskich ad poiowy XVI do początku XIX wieku. – Warszawa, 1970; Baranowski, A.J. Bartolomiej Nataniel Wąsowski teoretyk i praktyk architektury XVII wieku. – Wrociaw, 1973; Baranowski, A.J. Bartolomiej Nataniel Wąsowski teoretyk i praktyk architektury XVII wieku / A.J. Baranowski -- Wrocław, 1973.
7. Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў (РДАСА), г. Масква, ф.2188, воп. 1, спр.44.
8. Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў (РДВГА), г. Масква, ф.349, воп.4, спр.7881.
9. РДАСА, ф.2188, воп.1, спр.44.
10. Paszenda J. Kościoi pojezuicki (farny w Grodnie). [w:] Kultura artystyczna Wielkiego Ksikstwa Litewskiego w epoce baroku. – Warszawa, 1995. – s. 191–213.
11. РДАСА, ф. 2188, воп.5, спр.2383, арк.14–15.
12. РДАСА, ф. 2188 воп,1, спр.35, арк.1.
13. РДАСА, ф. 2188, воп. 1, спр. 45.
14. РДВГА, ф. 825, воп.1, спр.43, арк.1.
15. Morelowski M. Znaczenie baroku wilecskiego XVIII stulecia. – Wilno, 1940.
16. РДАСА, ф.2188, воп.4, спр.3295, арк.1.
17. Poplatek J., Paszenda J. Słownik jezuitów artystów. – Kraków, 1972.
18. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА), г. Санкт-Пецярбург, ф. 485, воп.1, спр.241.
19. РДВГА, ф. 418, ВУА, спр.171.
20. Взрыв 1964 года в Полоцке языком документов // Полоцкий летописец. – 1992. – № 1.
21. РДГА, ф.822, воп.12, спр.2641.
22. Без-Корнилович, М.О. Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся / М.О. Без-Корнилович. – СПб., 1855 – 356 с.

PolotskSU



23. РДГА, ф.835, воп.1, спр.396, арк.3–7
24. РДГА, ф.822, воп.12, спр.2642, арк.1
25. Nasze kościoiy. Djecezja Mińska. / Pod red. J. Zyskara. TT. 1-2. – Warszawa–Petersburg, 1912-1913.
26. РДГА, ф.822, воп.12, спр.2636, арк.1
27. РДАСА, ф.2188, воп.7, спр.404, арк.20
28. РДВГА, ф.349, воп.19, спр.2504
29. РДГА, ф.1289, воп.2, спр.735, арк.1,2
30. РДАСА, ф.2188, воп.1, спр.60, арк.1
31. РДАСА, ф.2188, воп.1, спр.43, 51
32. РДГА, ф.1789, воп.14, спр.21, арк.1-1а
33. РДАСА, ф.2188, воп.1, спр.54, арк.2-5а
34. РДГА, ф.1293, воп.167, спр.75
35. Адамовіч С. Комплекс пінскага езуіцкага кляштара. //Наша вера. 1999, 3(9). – С.32–36.
36. РДАСА, ф.2188, воп.1, спр.49, арк. 1

**IDEOLOGICAL TEMPLE BUILDING PROGRAM OF THE JESUIT ORDER IN THE CONTEXT OF THE HISTORY OF ARCHITECTURE OF BELARUS**

T. GABRUS

The article is devoted to the role of the Jesuit order in the formation of the aesthetic concept of the world baroque style and in the monumental temple building in Belarus.
***Key words:*** *temple building, Jesuits, baroque style, architectural education, the relationship of building traditions*.



**Малюнак 1. – Нясвіж. Касцёл Божага Цела. План. Арх. Д.Бернардоні XVI ст.**

PolotskSU






а) касцёл і кляштар картэзіянцаў у Бярозе XVII ст.; б) касцёл і калегіум езуітаў у Полацк XVIII ст.
Малюнак 2. – Полацк. Касцёл св. Стэфана і калегіум езуітаў. План. XIX ст.




а) касцёл езуітаў у Воршы; б) касцёл езуітаў у Гродна; в) касцёл езуітаў у Лучаі; г) касцёл езуітаў у Віцебску
Малюнак 3. – Храмабудаўніцтва ордэна езуітаў гродзенскага і полацка-віцебскага рэгіёнаў. Планы касцёлаў

PolotskSU






**а) у Мсціславе; б) у Мінску; в) у Магілёве; г) у Пінску; д) у Крывошыне; е) у Юравічах**
**Малюнак 4. – Храмабудаўніцтва ордэна езуітаў Мінска-Магілёўскага і Палескага рэгіёнаў. Планы касцёлаў.**

УДК 94 (476) «1639»

## КСЁНДЗ і КНЯЗЬ: НЕКАЛЬКІ РАЗВАГ з НАГОДЫ АДНОЙ ПАЗЫКІ РЭКТАРА ПОЛАЦКАГА ЕЗУІЦКАГА КАЛЕГІЎМА ГЖЭГАЖА ГОФМАНА

**Галубовіч В.У.**
Рэспубліка Беларусь, Гродна

*У артыкуле прадстаўлена інфармацыя пра невядомы эпізод жыцця ў Полацку рэктара мясцовага езуіцкага калегіўма Гжэгажа Гофмана. Гофман кіраваў навучальнай установай у 1638-1640 гг. За гэты кароткі перыяд ён наладзіў рознабаковыя адносіны з мясцовымі жыхарамі, у тым ліку, шляхтай. Унікальны характар маюць выяўленыя звесткі пра заключэнне ў 1639 г. Гофманам дамовы аб пазыцы грошай прадстаўнікам мясцовага княжацкага роду Друцкім Саколенскім. Ажыццяўленне такой грашовай аперацыі сведчыць пра стабілізацыю фінансавага становішча полацкіх езуітаў, павелічэнне сродкаў іх уплываў на Полаччыне.*
***Ключавыя словы:*** *Полацкі езуіцкі калегіум, Гжэгаж Гофман.*

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
# ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
# І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Навапалацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^{1}/_{8}$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.